ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР 10 ЛІСТАПАДА 1977 г.

№ 30 (1180)

Цана 2 кап.

## Набору студэнтаў — пільную ўвагу

**На пасяджэнні савета універсітэта былі падведзены вынікі прыёму студэнтаў у 1977 годзе. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў прарэктар па вячэрняму і завочнаму навучанню, намеснік старшыні прыёмнай камісіі У. С. БАГДАНАЎ. Сёння мы друкуем вытрымкі з яго даклада.**

Рэктарат, партком, дэканаты і грамадскія арганізацыі універсітэта прарабілі значную работу па арганізацыі і правядзенню прыёму студэнтаў у гэтым годзе. Яны своечасова распрацавалі агульнауніверсітэцкі і факультэцкія планы работы па арганізацыі набору, здзяйснялі пастаянны кантроль за работай прыёмнай камісіі. На пасяджэнні рэктарата двойчы заслухоўвалася пытанне аб падрыхтоўцы і правядзенні набору студэнтаў. Праводзіліся нарады з дэканамі і старшынямі экзаменацыйных камісій, экзаменатарамі і тэхнічнымі супрацоўнікамі прыёмнай камісіі. Састаў прыёмнай камісіі быў зацверджан парткомам універсітэта, экзаменатары прадметных экзаменацыйных камісій і тэхнічны персанал былі рэкамендаваны партыйнымі бюро факультэтаў.

Вялікая ўвага аддавалася прафесійнай арыентацыі абітурыентаў, прыёму ва ўніверсітэт рабочай і сельскай моладзі. Гэтаму пытанню былі прысвечаны выступленні па радыё, тэлебачанню, у друку работнікаў рэктарата, прыёмнай камісіі, выкладчыкаў, дэканаў.

Ва універсітэце працавалі школы юных фізікаў, хімікаў, матэматыкаў, біёлагаў, гісторыкаў, юрыстаў, географаў, праводзіліся алімпіяды школьнікаў і дні адкрытых дзвярэй. Ва ўсе школы рэспублікі, на буйныя прадпрыемствы, у многія саўгасы і калгасы былі разасланы Правілы прыёму ў БДУ. Многія выкладчыкі выязджалі ў розныя раёны для правядзення гутарак аб асаблівасцях прыёму ва універсітэт; працавалі ва універсітэце завочныя і вячэрнія падрыхтоўчыя курсы.

Праведзеная падрыхтоўчая работа садзейнічала паспяховаму правядзенню набору. План прыёму па ўсіх формах навучання і пазаконкурснаму адбору для іншых ВНУ выканан. На дзённую форму навучання на 2028 месц было пададзена 4462 заявы. Конкурс заяў у сярэднім па універсітэту на дзённую форму навучання склаў 2,6 на адно месца.

Медалістаў і выдатнікаў сярэдніх навучальных устаноў было 772, пахвальныя граматы па асобных прадметах мелі 1078 абітурыентаў. На вячэрняе аддзяленне на 575 месц было пададзена 732 заявы, а на завочны факультэт на 525 месц — 1235 заяў. Конкурс сярод вытрымаўшых уступныя экзамены на дзённую форму навучання склаў 1,7 чалавека на месца.

З ліку прынятых на дзённую форму навучання рабочых і дзяцей рабочых — 42,7 працэнта, калгаснікаў і дзяцей калгаснікаў — 10 працэнтаў, служачых і дзяцей служачых — 47,3 працэнта, членаў КПСС і кандыдатаў у члены КПСС — 6,21 працэнта, са стажам работы 2 і больш гадоў і звольненых у запас з радоў Савецкай Арміі — 21,4 працэнта. З падрыхтоўчага аддзялення залічана 318 студэнтаў. На вячэрняе аддзяленне з ліку працуючых па выбранай спецыяльнасці залічана 160 чалавек, на завочны факультэт — 343.

Залічэнне ў лік студэнтаў праведзена ў строгай адпаведнасці з правіламі прыёму ў ВНУ ў 1977 годзе і дапаўняючымі іх загадамі і інструктыўнымі пісьмамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і БССР.

Разам з тым неабходна адзначыць некаторыя недахопы па арганізацыі набору. Не ўсе дэканаты факультэтаў з вялікай адказнасцю аднесліся да падбору памочнікаў адказнага сакратара па групах спецыяльнасцей і саставу тэхнічных сакратароў, у выніку чаго неаднаразова праводзілася замена памочнікаў адказнага сакратара і тэхнічнага персаналу, што перашкаджала рабоце прыёмнай камісіі.

Некаторыя экзаменатары не ўносілі ў экзаменацыйныя лісткі абітурыентаў удакладняючыя і дадатковыя пытанні. Адмоўна адбілася на арганізацыйнай рабоце па прыёму студэнтаў адсутнасць пастаяннага мастака ў саставе прыёмнай камісіі. Некаторыя факультэты не вялі сістэматычнай работы па прыцягненню ва універсітэт моладзі, асабліва на вячэрнія аддзяленні.

Усе гэтыя адмоўныя бакі неабходна дэталёва прааналізаваць і ўлічыць пры арганізацыі набору студэнтаў у будучым навучальным годзе.

## Удастоены высокага гонару

Мільёны савецкіх людзей сустрэлі свята Вялікага Кастрычніка высокімі паказчыкамі ў працы і вучобе. Свой уклад у дастойную сустрэчу гэтай знамянальнай даты ўнесла студэнцкая моладзь рэспублікі. Выдатная вучоба — такі падарунак студэнтаў Вялікаму Кастрычніку.

Напярэдадні свята ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны сабраліся камсамольцы, студэнты філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна, пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва за права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола ЦК КПСС да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка. У залу ўносіцца сцяг. Затым намеснік сакратара камітэта камсамола Віктар Атакін зачытвае рапарт.

Высокага гонару падпісаць рапарт былі ўдастоены Ала Графман, студэнтка II курса рускага аддзялення; Марыя Пуроўская, студэнтка III курса беларускага аддзялення; Валянціна Зубарэвіч, чацвёртакурсніца беларускага аддзялення, купалаўскі стыпендыят і іншыя.

Затым слова бярэ выкладчыца Ларыса Лявонцьеўна Кароткая, удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. Яна віншуе камсамольцаў з вялікім святам.

Пасля падпісання рапарта студэнты наведалі музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

І. ГУСЬКО.

## Усім сваім жыццём...

**Расказвае член КПСС з 1922 года, Герой Савецкага Саюза, генерал-маёр у адстаўцы Аляксандр Васільевіч КІРСАНАЎ**

— Назаўжды запаў у памяць эпізод з дзяцінства. Быццам учора гэта было. Шасцігадовым хлапчуком у прыцемках прыбег дадому. Якраз бацька з работы прыйшоў. Бачу, прысеў ён на ўслончык, дастаў газету, пачытаў, а потым кажа: «Вось табе маеш... Японцы напалі на нас...» Маці заплакала. Потым я сваімі вачыма бачыў, што азначалі бацькавы словы. Вайна, праўда, не прынесла ахвяр нашай сям'і. Але галеча, голад сталі яшчэ больш адчувальныя.

Пра бальшавікоў я пачуў, калі пачалася новая вайна. Гаварылі, што ёсць такая партыя, якая супраць вайны змагаецца, лепшую долю хоча народу даць. Вось, думаю, сустрэцца б мне з імі, пабачыць, што гэта за людзі. Пашчасціла — сустрэўся. Я першыя ленінскія дэкрэты ў сваіх вось руках трымаў. Бачыў, як працоўны люд да іх, як да праўды, цягнуўся. Да гэтага часу дэкрэт аб міры напамяць ведаю. Што ж, падумаў я тады, трэба і табе, Кірсанаў, за справу брацца.

Ваяваць давялося на Усходнім фронце. Трапіў я ў былую Чапаеўскую дывізію, артылерыстам мяне залічылі. У нашай батарэі са 118 чырвонаармейцаў усяго 12 пісьменных было. Астатнія замест свайго подпісу крыжыкі ставілі. Да сённяшняга дня гэта ў ваччу стаіць. Але ж як цягнуліся да святла!

Аднойчы ў час перадышкі паміж баямі падышоў да мяне камісар батарэі і гаворыць: «Вось што, чырвонаармеец Кірсанаў. Звернецца тут да цябе матрос, камуніст — Кузьмой завуць, — дык ты яго грамаце навучы. Зрабі гэта так, каб менш хто бачыў — вельмі ўжо чалавек бянтэжыцца, што непісьменны». На другі дзень падыходзіць да мяне матрос, пытае: «Ведаеш, чаго я прыйшоў?» А я ўжо буквар падрыхтаваў. Ну, і пачаў яго вучыць. Вывучылі тры літары. Назаўтра яшчэ тры. А потым ён прыходзіць і гаворыць: «Доўга вучыш. Лічы літары». Падлічылі. Трэба яшчэ сем дзён займацца. «Не магу, — гаворыць, — нічога не атрымаецца. Цярпення не хапае». Не, браце, адказваю, у мяне загад камісара. Не выканаць яго не маю права. Цярпі. Праз паўтара месяца Кузьма чытаць пачаў..

Вось тады вырашыў я ў партыю Леніна ўступіць. Напісаў заяву, аддаў сакратару партячэйкі. Дывізія наша якраз Іркуцк займала. Праз пяць дзён далі мне анкету запоўніць. Сакратар партячэйкі пытаецца: «Як запаўняць будзеш? Вось пытанне наконт таго, ці заўсёды будзе Савецкая ўлада?..» Па сутнасці, ён пра дыктатуру пралетарыяту спытаў. Як я мог адказаць? Вядома, заўсёды. Тады ён мне Леніна параіў пачытаць. Парада, самі разумееце, слушная. Але толькі праз год я змог яе ажыццявіць. Вось гэтую кніжачку «Дзіцячая хвароба «левізны» ў камунізме» я летам 1921 года прачытаў. Увогуле ўсё было зразумела. Потым праз 10 гадоў у Вышэйшай артылерыйскай школе перачытаў. Успрыняў неяк інакш. Трэці раз чытаў, калі ў Акадэміі Генеральнага штаба вучыўся, і чацвёрты — вось тут, на гэтай кватэры. І кожны раз яна пакідала розныя ўражанні, давала нешта новае. Вось якая невычарпальная крыніца ленінскай думкі! Я ўжо зусім не бачу, а вы вазьміце адгарніце закладзеную старонку, пачытайце там унізе, як ён разумных людзей характарызуе. Праз усё жыццё пранёс я гэтыя словы. У любых умовах, перад кожнай справай я гаварыў сабе: трэба думаць. А калі, здаралася, памыляўся, то знаходзіў у сабе сілы не апускаць рук, а дзейнічаць, выпраўляць памылку.

Ну, дык вось, пытаецеся, як мяне ў партыю прымалі? Памятаю той партыйны сход да драбніц. Уставалі ўсе, хто мяне ведаў, і гаварылі: у гэтым баі Кірсанаў паводзіў сябе так, у другім — так, а ў трэцім — вось так. 17 сакавіка 1920 года прынялі мяне ў рады спачуваючых (кандыдатаў у члены партыі тады так называлі). Адразу ж даручылі праводзіць з байцамі палітзаняткі.

Калі пачалося скарачэнне радоў арміі, я таксама меў намер дэмабілізавацца. Але мяне выклікаў камісар і сказаў: «Больш за ўсё, Кірсанаў, вы патрэбны цяпер тут, у Чырвонай Арміі. Прапаную вам пайсці ў ваенную школу. Падумайце, а як вырашыце — прыходзьце». Словы гэтыя і цяпер гучаць у маіх вушах. Вось тады і ўсплыў у маёй памяці той эпізод з дзяцінства, прыпомніліся ўсе нягоды, звязаныя з войнамі. Я так разважаў: калі ў нас будзе мір, то будзе і шчаслівае жыццё, будзе квітнець наша маладая Рэспубліка Саветаў. А для гэтага патрэбен надзейны шчыт — армія. І я застаўся.

Потым мне яшчэ раз пашчасціла служыць у адным з палкоў легендарнай Чапаеўскай

(Заканчэнне на 2-й—3-й стар.).



Галоўны пост Краіны Саветаў.

## Лірычны маналог

У дні юбілеяў асабліва задумваешся над пражытымі гадамі. Табе, Радзіма, шэсцьдзесят. З гэтых гадоў мы складаем толькі невялікую частку. Мы — пакаленне дваццацігадовых, пакаленне моцных, эрудзіраваных, упэўненых, улюбёных.

Так, мы любім цябе, Радзіма. Гавораць, гэтаму пачуццю нельга навучыць, як нас вучаць алгебры і геаметрыі. Нельга нават сказаць, калі, у які пэўны момант яно нараджаецца. Калі ўсведамляецца. Хіба толькі...

Памятаю, ішлі мы па лясной сцяжынцы ў глухую вёску — па яблыкі. Ведалі, што паласуемся. Вёска ціхая, негаманкая. Ажывае толькі летам, калі прыязджаюць дачнікі. Садзілася сонца. Па дарозе беглі цені. А вось і хаты. Мы ўвайшлі ў вёску з боку пачарнелых ад часу вялізных ліп. І раптам убачылі нечаканае. У цэнтры, на расчышчанай пляцоўцы, стаяў абеліск. Ля падножжа яго струменілася крыніца. Празрысты ручай знікаў у траве. На абеліску блішчэў надпіс: «Славы ніхто ў цябе не выпрошваў, Радзіма, проста быў выбар у кожнага: я ці Радзіма». І крыху ніжэй: «У памяць загінуўшым аднавяскоўцам».

Ж. ПАГАРЭЛАВА.





Перад прэм'ерай.

Фота В. ДРАЧОВА.

тым перайсці ў наступленне. У гэтым баі geраічна загінулі камуністы Акын Курманаў, Іван Баладурын, камсамолец Георгій Маслякоў. Ім было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У мяне нярэдка школьнікі пытаюць: ці страшна было на вайне? Вядома, адказваю, страшна. Але не ад таго, што кулі вакол свішчуць, смерць на кожным кроку падпільноўвае. Больш за ўсё я баяўся за тое, каб выстаяць, пачэсна выканаць свой абавязак, каб мне перад сям'ёй і таварышамі маімі не было сорамна. Не я адзін так думаў. Кожны рызыкаваў сваім жыццём, бо ведаў, што ніхто за яго не пойдзе ў атаку, сваімі рукамі трэба задушыць ворага ды мірнае жыццё наладзіць...

Успамінаецца мне адзін выпадак. Было гэта ў сорак чацвёртым годзе каля польска-германскай граніцы. Пасля жорсткіх баёў нашу дывізію перавялі ў другі эшалон. Нечакана загад прыйшоў: прыступіць да ўборкі ўраджаю. Цэлыя палі тады стаялі некранутыя — не было каму ўбіраць. Прызнацца, я спачатку разгубіўся. Потым паехаў у адзін полк, у другі, гавару: таварышы, такая і такая справа, як гэта арганізаваць? І што вы думаеце? Праз дзень-два ў мяне ўжо не дывізія была, а цэлы калгас. Знайшліся і старшыня, і аграном, і калгаснікі, і спецыялісты па нарыхтоўках, бухгалтары. Кузню сваю адкрылі, слясарыць, цяслярыць пачалі. Люба было паглядзець, як людзі завіхаліся ля мірных прылад. Больш сімвалічнай карціны я не бачыў. Тады я падумаў: армія — гэта народ. Ні бязлітасныя баі, ні кроў, ні смерць не закамянілі сэрцаў савецкіх людзей, не спынілі іх прагнага імкнення да стваральнай працы. Цярпенне, стойкасць — вось што ў іх характары.

А адкуль жа ўзяліся гэтыя якасці, чаму ў савецкага чалавека праявілася рэдкая непахіснасць і жыццяздольнасць? Толькі таму, што ў яго ёсць такая партыя—партыя Леніна, партыя міру.

Я лічу за найвялікшы гонар, што вось ужо пяцьдзесят пяць гадоў з'яўляюся членам такой партыі, што ўсім сваім жыццём уносіў пасільны ўклад у яе кроўную справу — справу захавання міру.

**Запісаў В. РОШЧЫН.**

ЖУРФАКУ — 10 ГОД.

# Са святам, мой факультэт!

Я бясконца шчаслівая, што магу сказаць табе, мой лепшы сябар і настаўнік, гэтыя словы. Ты прыйшоў да мяне з блакітнай мары ў вобразе добрага чараўніка. Стаў бясконца родным і блізкім. Ды і зараз вобраз гэты нікольki не згас. Іншым і не ўяўляю.

Добра ведаю, што наперадзе шмат цяжкасцей. Але твае выхаванцы ніколі не спыняліся перад імі. Яны працуюць ва ўсіх шматыражных, раённых, абласных і рэспубліканскіх газетах, на радыё, тэлебачанні, у выдавецтвах, БЕЛТА. Сярод іх — рэдактар «Советской Белоруссии» А. К. Зінін, рэдактары рэспубліканскіх маладзёжных газет, вядомыя паэты і пісьменнікі Беларусі Барыс Сачанка, Іван Чыгрынаў, Уладзімір Паўлаў. Тваіх выпускнікоў можна сустрэць на далёкай поўначы і гарачым поўдні, у Чэхаславакіі і Польшчы, ГДР і Венгрыі.

І вось нядаўна ў перадсвяточныя дні ты пасвяціў у студэнты новы атрад першакурснікаў. Ты дапамажаш ім пазнаць таямніцы журналісцкай дзейнасці Пушкіна, Чарнышэўскага, Бялінскага... І дзякуючы табе кожны з іх знойдзе сваю сцяжынку ў журналістыцы.

**В. КОЗЕЛ.**



# У гасцях у праграмістаў




ФПМ — адзін з самых папулярных факультэтаў у БДУ. А самай цікавай кафедрай на факультэце прыкладной матэматыкі па праву лічыцца кафедра агульнага праграміравання.

Што з'яўляецца прычынай яе папулярнасці? На гэтае пытанне нам адказвае загадчык кафедры агульнага праграміравання, дацэнт **Генадзь Антонавіч ДРАБУШЭВІЧ:**

— Шмат каго зацікавіла ўведзеная ва універсітэце аўтаматызаваная сістэма кіравання. У цяперашні час на ўсіх факультэтах БДУ ўкаранёны першыя дзве падсістэмы — «Сесія» і «Стыпендыя», укараняецца падсістэма «Інтэрнат». Сутнасць іх работы заключаецца ў тым, што машына друкуе экзаменацыйныя ведамасці, апрацоўвае вынікі сесіі, дае рэкамендацыі стыпендыяльным камісіям. АСК БДУ упарадкавала сістэму пераздачы экзаменаў, яна дазволіць перайсці толькі на машыннае размеркаванне інтэрната і стыпендый студэнтам.

Распрацоўка АСК БДУ на аснове адзінай сістэмы электронна-вылічальных машын і адзінага інфармацыйнага банка — адна з асноўных тэм навукова-даследчай работы кафедры. Толькі па гэтай тэматыцы апублікавана і здадзена ў друк у 1977 годзе 8 навуковых работ.

Гасдагаворная работа на кафедры вядзецца пры ўдзеле навукова-даследчага і праектна-тэхнічнага інстытута арганізацыі і тэхнікі кіравання. Аб'ём гасдагаворнай работы роўны аднаму мільёну рублёў за пяцігодку. Распрацоўкі кафедры ўкаранёны ўжо на 27 прадпрыемствах краіны. Эканамічны эфект ўведзеных задач склаў звыш аднаго мільёна рублёў.

**— ЯКІ ЎДЗЕЛ У РАБОЦЕ КАФЕДРЫ ПРЫМАЮЦЬ СТУДЭНТЫ?**

— Студэнты, асабліва пятага курса, аказваюць нам вялікую дапамогу ў выкананні заданняў. У мінулым годзе 28 студэнтаў-пяцікурснікаў праходзілі на кафедры вытворчую практыку. Амаль усе яны былі залічаны на штатныя пасады матэматыка-праграміста. У гэтым годзе практыку праходзяць 19 чалавек. Вялікую ўвагу мы ўдзяляем таксама навукова-даследчай рабоце студэнтаў. У 1976 годзе, напрыклад, на студэнцкай навуковай канферэнцыі пад кіраўніцтвам супрацоўнікаў кафедры было зроблена 93 даклады, 20 работ было прадстаўлена на рэспубліканскі, а 3 работы — на Усесаюзны агляд студэнцкіх навуковых работ. Работа студэнткі Далжанковай адзначана дыпломам Усесаюзнага конкурсу, а работа студэнткі Голубевай — прэміяй на рэспубліканскім конкурсе. Закранаючы пытанне аб паспяховасці, дастаткова сказаць, што 9-я група V курса, якая спецыялізуецца на кафедры, на працягу двух гадоў з'яўляецца лепшай па паспяховасці на факультэце.

**— ГЕНАДЗЬ АНТОНАВІЧ, ПРЫ КАФЕДРЫ СТВОРАНА «ШКОЛА ЮНАГА ПРАГРАМІСТА». РАСКАЖЫЦЕ АБ ЁЙ.**

— Школа пачала працаваць з 1975 года. Дзякуючы ёй спецыялізацыю студэнтаў мы пачынаем не з І курса, а з 9-га класа. Толькі ў гэтым годзе ў школу пададзена звыш 300 заяў ад вучняў 9—10-х класаў. У 1976 годзе ў школу было залічана 300 вучняў, многія з іх потым паступілі на ФПМ. Можна з упэўненасцю сказаць, што школа карыстаецца вялікім поспехам у старшакласнікаў.

**— І АПОШНЯЕ ПЫТАННЕ. РАСКАЖЫЦЕ АБ ЗАДАЧАХ І ПЛАНАХ КАФЕДРЫ НА БУДУЧАЕ.**

— У цяперашні час мы плануем пачаць выпуск серыі метадычных указанняў па курсах «ЭВМ і праграміраванне», «Практыкум на ЭВМ». Плануецца таксама выдаць зборнік навуковых работ кафедры.

Перад праграмістамі стаяць канкрэтныя задачы: забяспечыць далейшае развіццё і павышэнне эфектыўнасці АСК і вылічальных цэнтраў, паслядоўна аб'ядноўваючы іх у агульнадзяржаўную сістэму збору і апрацоўкі інфармацыі. У выкананні гэтых задач удзельнічаюць усе работнікі кафедры.

**Інтэрв'ю правёў Георгій ЖУРКО.**

# ЧУЛАСЦЬ, ДАБРАТА, ПРАЦАВІТАСЦЬ

Працоўны стаж Ніны Фёдараўны Алькінай складае 26 год. І ўсе гэтыя гады яна працавала ў друкарні Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Пачынала рабочай, цяпер — майстар участка.

Дырэктар друкарні М. Шкурдзюк, які завочна прадставіў мне Н. Алькіну, гаворыць аб ёй самае добрае: перадавы работнік вытворчасці, добры арганізатар, участак пад яе кіраўніцтвам пастаянна перавыконвае зменныя заданні. А затым з усёй перакананасцю сказаў:

— Ніна Фёдараўна зараз прыйдзе, пагаварыце з ёй, і я ўпэўнен, што гэтая размова застанецца ў вас у памяці надоўга.

Стройная жанчына з добрай усмешкай выклікала да сябе прыхільнасць. Сваю біяграфію Ніна Фёдараўна выкладае коратка: «Працаваць пайшла ў друкарню ў 46-м, у сувязі з хваробай шэсць гадоў не працавала, потым зноў прыйшла ў свой цэх, на сваё месца».

Вось так — аб усім жыцці адным сказам. Сціпласць? Так. Яна здзівілася, чым яе звычайная біяграфія працоўнага чалавека магла зацікавіць карэспандэнта газеты.

Чым больш мы гаварылі, тым глыбей раскрываўся ўнутраны свет гэтай абаяльнай жанчыны. Хацелася запісаць яе словы на магнітафонную стужку, каб узнавіць дзе-небудзь перад школьнікамі і вучыць іх адносінам да працы іменна гэтымі словамі.

— Вы толькі зразумейце мяне правільна, не падумайце, што гэта громкія словы. Наша маленькая друкарня стала для мяне другім домам, а калектыў — другой сям'ёй. Я ж дома праводжу толькі вечар і ноч. А назаўтра зноў у цэх, зноў да сваіх дзяўчат. Ад'язджаю ў адпачынак — тыдзень жыву спакойна. А потым месца не знаходжу — як там дзяўчаты, ці працуюць машыны, ці выконваецца план? І нічога з сабой зрабіць не магу, і адпачынак ужо не адпачынак.

— Да нас штогод прыходзяць практыканткі з паліграфвучылішча. Усю душу выкладваеш, каб перадаць ім таямніцы будучай прафесіі, каб адчулі яны сябе раўнапраўнымі членамі калектыву. У нас вельмі дружны калектыў, усе дзеляць пакуты і радасці адзін аднаго, агульная справа становіцца клопатам кожнага.

— Галоўнымі рысамі чалавека я лічу дабрату, чуласць, працавітасць. Іменна гэтыя якасці з'яўляюцца крытэрыем ісціннай ацэнкі асобы.

У гэтых словах заключана жыццёвая пазіцыя Ніны Фёдараўны. Яна знаходзіць сцверджанне і ў выказваннях таварышаў Н. Алькінай па працы — маладых лінатыпістак Валі Радзюк, Веры Страпчанкі, Анастасіі Лапушкінай, наборшчыцы Валянціны Аляксандраўны Другаль, якая прапрацавала разам са сваім майстрам каля 20 гадоў.

— Калі не працуе машына, калі не выконваецца план, калі проста дрэнна на душы — ідзём да Ніны Фёдараўны як да майстра і проста чулага чалавека. Яна заўсёды дапаможа. Яна адным словам можа сагрэць душу, яе сэрца хапае на ўсіх.

І я ўпэўнен — такія словы магла б сказаць любая з 50 вучаніц Н. Алькінай, у розныя часы атрымаўшых у яе атэстат на прафесійнае майстэрства.

На днях Ніне Фёдараўне споўнілася 50 год. Шмат віншаванняў атрымала яна ў гэты дзень. Хочацца і нам шчыра пажадаць Ніне Фёдараўне доўгага і шчаслівага жыцця, новых працоўных поспехаў.

**Я. ЧАПЛЯ.**

# ПРЫСВЕЧАНЫЯ КАСТРЫЧНІКУ

На філалагічным факультэце БДУ адбыўся заключны канцэрт фестываля самадзейнай творчасці замежных студэнтаў падрыхтоўчага факультэта, прысвечаны 60-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

У госці да замежных студэнтаў прыйшоў удзельнік штурму Зімняга, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, кавалер ордэнаў Леніна і Чырвонай Зоркі Пётр Уладзіміравіч Чыгрын. Ветэран падзяліўся ўспамінамі аб цяжкіх гадах барацьбы з царызмам.

— У 1905 годзе царскі ўрад абвясціў свабоду слова, друку. Але свабоду гэтую мы атрымалі толькі фармальна, на самай справе яе не было і ў паміне, — пачаў расказваць Пётр Уладзіміравіч.—18 кастрычніка на Прывакзальнай плошчы горада Мінска адбыўся мітынг сялян. На ім выступіў Іван Пуліхаў (яго імя носіць адна з вуліц горада-героя Мінска). Яго прамову перарвалі вінтовачныя стрэлы. Гарадскі генерал-губернатар даў загад страляць у мірных грамадзян. У гэты восеньскі дзень у Мінску загінула каля 100 чалавек.

— У студзені 1906 года, — працягваў П. У. Чыгрын, — Пуліхаў зрабіў замах на жыццё генерал-губернатара Курлава. Але спроба гэта скончылася беспаспяхова: храбрэц быў пакаран смерцю.

Затым камуніст П. У. Чыгрын расказаў пра сваю падпольную дзейнасць на Балтыйскім заводзе ў г. Пецярбургу, дзе ён працаваў слесарам з 1910 па 1915 год:

— Як цяпер, памятаю вясновы дзень 15 мая 1915 года, калі я быў прызначан на Балтыйскі флот. Вучэбны карабель «Азія» стаў з таго часу маім родным домам.

Цікава і падрабязна Пётр Уладзіміравіч расказаў прадстаўнікам 37 краін свету аб гістарычных падзеях 1917 года, актыўным удзельнікам якіх ён быў. З асаблівай цікавасцю слухалі ўсе прысутныя ўспаміны аб асабістай сустрэчы П. У. Чыгрына з правадыром Савецкай дзяржавы Уладзімірам Ільічом Леніным.

Студэнт з Тога Амакоэ Ама падарыў ветэрану рэвалюцыі ў памяць аб сустрэчы кнігу «Мінск — горад-герой» і чырвоныя гваздзікі.

Затым пачаўся канцэрт. Яго адкрылі студэнты з Конга. У гэты вечар прадэманстравалі сваё майстэрства прадстаўнікі Мадагаскара, Лаоса, Малі, Лівана, Сірыі, Палесціны і іншых краін свету. Пратэст супраць імперыялізму і рэакцыі быў галоўнай тэмай фестываля.

**А. ЖУРАЎЛЁЎ.**

## Так працуе культмасавы сектар

У аглядах-конкурсах мастацкай самадзейнасці філалагічны факультэт заўсёды займаў прызавыя месцы. Ды гэта і не дзіўна, бо на факультэце добра наладжана культурна-масавая работа. Арганізаван і працуе танцавальны гурток. Хор філфака — адзін з лепшых ва універсітэце, ёсць тут і вакальна-інструментальны ансамбль. Гэтыя калектывы выступаюць не толькі на аглядах-конкурсах. Ні адзін вечар на факультэце не прайшоў без удзелу ансамбля, танцавальнага гуртка, хору. На факультэце ёсць таксама і калектывы мастацкай самадзейнасці замежных студэнтаў. Гэта польскі ансамбль, лаўрэат Усесаюзнага конкурсу мастацкай самадзейнасці, які ў асноўным складаецца са студэнтаў IV курса, а таксама калектыў польскіх першакурснікаў «Варшаўскі фальклор».

Ужо ў гэтым семестры філолагі правялі некалькі цікавых вечароў. Сярод іх свята для першакурснікаў: пасвячэнне ў студэнты і вечар савецка-германскай дружбы, дзе госці з ГДР выступілі са сваёй канцэртнай праграмай. Вечар, які называўся «Мы — твае бацькі і дзеці», быў прысвечан юбілею Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Акрамя гэтага, адбылася сустрэча студэнтаў філфака з міністрам культуры БССР Ю. М Міхневічам, які пазнаёміў будучых педагогаў з сучаснымі праблемамі мастацтва і з тым, як развівалася культура нашай краіны на працягу шасцідзесяці савецкіх гадоў.

Г. ГРЭЛЬ.

### Твой этыкет

## ЧАЛАВЕК СЯРОД ЛЮДЗЕЙ

Вядомы савецкі рэжысёр Н. Акімаў пісаў: «Трэба любіць людзей. Знаёмых і незнаёмых. Няхай не ўсіх, але значную большасць... Карысна памятаць, што ва ўсіх людзей ёсць недахопы, што ўласныя менш прыкметны, чым чужыя. Усім сваім відам і паводзінамі трэба заклікаць людзей да добрых узаемаадносін. Трэба.. кожны дзень рабіць на вуліцы, дома, на рабоце хаця б маленькі ўклад у паляпшэнне чалавечых адносін».

Натуральныя чалавечыя слабасці трэба ўмець не заўважаць, не фіксаваць на іх увагу, быць цярпімымі. Да людзей трэба адносіцца так, як вы хочаце, каб яны адносіліся да вас. Калі б гэта заўсёды ўлічвалася, мы б менш сустракаліся з хамствам, якое праяўляецца там, дзе яно не знаходзіць адпору; з абмежаванасцю абывацеля, не здольнага паставіць сябе на месца іншага; пагардлівасцю сябелюба, перакананага ў сваёй бясспрэчнай перавазе над іншымі; ваінственнасцю мешчаніна, які шукае падставу, каб спагнаць свой дрэнны настрой на ўсіх акружаючых.

Пажылым ці хворым суседзям неабходна аказваць увагу, пасільныя паслугі.

Культурны чалавек не ўчыняе скандалаў з-за таго, што паверхам вышэй бегае і скача дзіця ці цяжка ступае сусед.

Калі святкаванне зацягнулася, не замарудзьце на другі дзень папрасіць прабачэння ў суседзяў, якіх гэта магло патурбаваць (гэта не значыць, што кожны раз можна шумець і прасіць прабачэння). Можна папярэдзіць бліжэйшых суседзяў, што ў вас сёння ўрачыстасць і вы прыносіце прабачэнні за магчымыя турботы.

Кожны можа арганізаваць сябе ў сваім выхаванні, весці свядомую, сістэматычную, планамерную працу над сабой. Прыгледзьцеся да сябе ўважліва, ацаніце, якія рысы вам не падабаюцца, ад якіх недахопаў хацелі б пазбавіцца, што выхаваць у сабе. Вырашыўшы змяніць нешта, абдумвайце дакладна, як будзеце гэта выконваць, з чаго пачняце, чаго дасягнеце сёння, заўтра. А каб лягчэй было рухацца да мэты, глядзіце на сябе вачыма паважанага ці каханага чалавека.

Сярод усіх звычак уменне разумець сябе, валодаць сабой — адна з важнейшых.



Дом-музей I з'езда РСДРП. Фота В. ДРАЧОВА.

### Стань журналістам, навічок!

## ПАСВЯЧЭННЕ Ў СТУДЭНТЫ

У Доме кіно адбылося ўрачыстае пасвячэнне першакурснікаў факультэта журналістыкі ў студэнты. На студэнцкае свята прыйшлі старэйшыя працаўнікі друку і кіно, ветэраны вайны.

Вечар адкрыў старшыня юбілейнай камісіі факультэта прафесар А. І. Наркевіч.

Затым слова было прадастаўлена дэкану факультэта журналістыкі прафесару Р. В. Булацкаму. У сваім выступленні ён расказаў аб падрыхтоўцы журналістаў у нашай краіне. З прывітальным словам да будучых творчых работнікаў звярнуўся старэйшы супрацоўнік друку, ветэран Вялікай Айчыннай вайны А. Л. Матусевіч. Журналіст падзяліўся сваімі ўспамінамі аб рабоце ў рэспубліканскай газеце. Прывёў цікавыя эпізоды са сваіх творчых камандзіровак.

Сакратар камсамольскай арганізацыі акадэмічнай групы студэнтка III курса Н. Косарава заклікала ўсіх студэнтаў вучыцца яшчэ лепш, прадаўжаць слаўныя традыцыі савецкіх журналістаў. Пасля святочнага канцэрта студэнты-журналісты далі клятву маладога журналіста, у якой гаворыцца: «Я, малады журналіст, абраўшы на ўсё жыццё цяжкую прафесію журналіста, клянуся быць дастойным прадаўжальнікам прафесіі Уладзіміра Ільіча Леніна, Джона Рыда, Юліуса Фучыка, заўсёды знаходзіцца на пярэднім краі падзей, быць верным салдатам партыі, аб'ектыўным летапісцам сучаснасці...».

Клятва заканчваецца словамі: «...Няхай да канца майго жыцця не ржавее пяро, не стоміцца рука, не перастануць быць зоркімі вочы, не пагасне ў маім сэрцы любоў да людзей».

У заключэнне вечара студэнты старэйшых курсаў заклікалі першакурснікаў быць актыўнымі ўдзельнікамі ўсіх карысных пачынанняў на факультэце. Другакурснікі падарылі навічкам ручку-сувенір, торт. Студэнты III курса ўручылі ім сімвалічны ключ.

Вечар прайшоў цікава. Першакурснікі з радасцю ўвайшлі ў дружную студэнцкую сям'ю. Добрай табе вучобы, першакурснік!

А. ІВАНОЎ.

### Спорт

## Традыцыйны асенні

У традыцыйным асеннім лёгкаатлетычным кросе, які праходзіў у маляўнічай мясцовасці ля Камсамольскага возера, прынялі ўдзел звыш трох тысяч студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна.

Першымі пачаліся забегі ў дзяўчат на дыстанцыю 500 метраў. Барацьба за першае месца была вельмі вострай і напружанай. З вынікам 1 мінута 28 секунд перамагла студэнтка першага курса біяфака А. Паўлоўская. Другі вынік паказала пяцікурсніца факультэта прыкладной матэматыкі І. Міскевіч — 1 мінута 29 секунд. Трэцім прызёрам стала Т. Мазалеўская (юрфак).

У юнакоў на дыстанцыі 1000 метраў з вынікам 2 мінуты 36 секунд перамог студэнт фізфака Уладзімір Квач. На секунду ад яго адстаў мінулагодні чэмпіён кроса Міхаіл Пыж. Яму належыць рэкорд універсітэта на гэтай дыстанцыі — 2 мінуты 34 секунды. Трэцяе і чацвёртае месцы падзялілі Сяргей Версан (гістфак) і Аляксандр Кекала (фізфак).

У агульнакамандным заліку перамаглі студэнты біяфака. Яны набралі 86 ачкоў, апярэдзіўшы хімфак амаль на ачко. Трэцяе месца заняла каманда геаграфічнага факультэта. Цікава адзначыць, што за ўвесь час правядзення кросаў геафакаўцы ніколі яшчэ не былі прызёрамі. Гэтыя спаборніцтвы сталі для іх добрым пачаткам.

На жаль, каманда факультэта прыкладной матэматыкі сёлета заняла толькі шостае месца. Апошнімі, адзінаццатымі, былі студэнты фізічнага факультэта. У спаборніцтвах прыняло ўдзел толькі 230 студэнтаў-фізікаў. Але і з іх далёка не ўсе добра прабеглі дыстанцыю.

Сярод каманд першых курсаў пераможцамі ва ўпартай барацьбе сталі студэнты біяфака. Усяго палову секунды прайгралі ім першакурснікі факультэта журналістыкі.

Калі падводзіць агульны вынік, то трэба падкрэсліць масавасць гэтых спаборніцтваў, добры, святочны настрой іх удзельнікаў.

С. ЛЫСКАВЕЦ.

## Аўтар — шахматная каралева

У гэтым годзе выдавецтва «Маладая гвардыя» выпусціла ў серыі «Спорт і асоба» кнігу Ноны Гапрындашвілі «Аддаю перавагу рызыцы».

Дзяўчына з невялікага грузінскага гарадка Зугдідзі ў дваццаць адзін год стала чэмпіёнкай свету па шахматах. З таго часу прайшло пятнаццаць год, але ніхто ў свеце не змог змяніць на троне ўвенчаную лаўровым вянком шахматную каралеву, міжнароднага гросмайстра, заслужанага майстра спорту СССР Нону Гапрындашвілі.

«Так, я не мыслю сабе жыцця без клетчатай дошкі і драўляных фігурак, то маўклівых, абыякавых і аднолькавых, а то красамоўных, тэмпераментных і рэзка не падобных адна на другую — у залежнасці ад таго, па якой прычыне, у якой сітуацыі ўступаеш з імі ў кантакт. Відавочна, гэта страсць, часам палкая, апаляючая, часам больш спакойная», — піша яна.

Любоў да шахмат — вось галоўны стрыжань кнігі. Стыль лаканічны, просты. І ўжо па ім можна меркаваць аб характары чэмпіёнкі свету—байцоўскім, мужным, аб манеры яе шахматнай гульні — рызыкоўнай, вострай, прыгожай.

Чытач даведваецца аб многім з гісторыі шахмат. Нона Гапрындашвілі расказвае аб сваіх папярэдніцах — чэмпіёнках свету Веры Менчык, Людміле Рудэнка, Лізавеце Быкавай, малюе партрэты выдатных шахматыстак — Мілункі Лазарэвіч, Ларысы Вольперт, Таццяны Затулоўскай, Кіры Зварыкінай, Валянціны Барысенка, Валянціны Казлоўскай.

Кніга асабліва каштоўна тым, што ў ёй спорт, шахматнае майстэрства разглядаюцца ва ўсіх аспектах — псіхалагічным, маральным, інтэлектуальным, эстэтычным.

Захапляючую аповесць аб шахматах дапаўняюць цікавыя фотаілюстрацыі.

Не дзіўна, што кніга знайшла дарогу да сэрцаў чытачоў. Нядаўна прайшло яе абмеркаванне ў трэцяй групе IV курса факультэта журналістыкі.

З. РУСАКОВІЧ.



На лекцыі. Фота В. ДРАЧОВА.

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС Мінск, універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 01551 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Заказ № 1747